Даслаць паштоўку Вользе Залатар можна па адрасе: РНПЦ псіхічнага здароўя, 220053 г.Мінск, Даўгінаўскі тракт, 152.

БОЛЬШАЯ ПОЛИТИКА

Первый и второй президенты Киргизии Аскар Акаев и Курманбек Бакиев объявлены в международный розыск

Первый и второй президенты Киргизии **Аскар Акаев** и **Курманбек Бакиев** объявлены в международный розыск по делу о работе крупнейшего в стране золотого месторождения Кумтор. Об этом сообщают *РИА Новости* и *ТАСС* со ссылкой на главу Государственного комитета национальной безопасности Киргизии **Камчыбека Ташиева**.

Ташиев также заявил, что по этому делу проходят и другие высокопоставленные фигуранты – в частности, бывшие киргизские премьер-министры **Апас Жумагулов**, **Омурбек Бабанов** и **Игорь Чудинов**, а также брат еще одного экс-президента страны **Сооронбая Жээнбекова**, бывший спикер парламента **Асылбек Жээнбеков** и младший сын Курманбека Бакиева **Максим**.

Экс-президента Акаева подозревают в злоупотреблении должностным положением при заключении соглашения с канадской компанией «Камеко» (Cameco Corporation). Эта компания с начала 1990-х годов разрабатывала золотое месторождение и была у истоков сделки, после которой Киргизия *«фактически утратила контроль над Кумтором»*. Между тем, по данным статистики Киргизии, доля Кумтора в общем объеме республиканского промышленного производства составляет около 20%.

Глава киргизских спецслужб отметил, что по аналогичным обвинениям, но уже за заключение более поздних соглашений объявлен в розыск и Курманбек Бакиев. Также следствием устанавливается возможная причастность к заключению заведомо невыгодных для республики договоров с канадскими компаниями бывших президентов **Алмазбека Атамбаева** и Сооронбая Жээнбекова. *«Если что-то выйдет, они будут привлечены к ответственности»*, – сказал в ходе пресс-конференции Камчыбек Ташиев.

В мае 2021 года, как пишет *ТАСС*, нынешнее руководство республики ввело внешнее управление на месторождении и фактически отстранило канадскую компанию «Центерра» от управления Кумтором. Стороны объявили о намерении начать судебные разбирательства по данному вопросу.

Акаев возглавлял Киргизию с 1991-го по 2005 год и был отстранен от должности в результате «Тюльпановой революции». После чего он уехал в Москву, где проживает до сих пор. Аналогично в ходе революции был свергнут и Бакиев, возглавлявший страну в 2005–2010 годах. Впоследствии его приговорили к высшей в Киргизии мере наказания – пожизненному заключению. Сейчас Курманбек Бакиев находится в Беларуси. Бишкек неоднократно требовал его экстрадиции, однако каждый раз получал отказ.

ОСОБЫЙ ВЗГЛЯД

Познер описал различие русских и американцев двумя словами


Владимир Познер. Фото: Анатолий Жданов / «Коммерсантъ».

Журналист и телеведущий Владимир Познер порассуждал о различиях между русскими и американцами. Он описал разницу между народами двумя словами, которые услышал от своего сына. Его размышления доступны в посте на официальной странице *«Яндекс.Дзен»*.

Познер отметил, что при попытке описать совокупность поведенческих и психологических черт, которые отличают русского от американца, *«получится поверхностная и невнятная чепуха»*. *«Между тем разница есть, несомненная и очевидная. Пытаясь определить ее суть одним точным словом в разговоре с сыном, я услышал от него определение, которое мне кажется исключительно удачным: другая, сказал он, заточка. Ну просто здорово как точно!»* – заявил журналист.

По словам ведущего Первого канала, все люди появляются на свет с определенным набором генов, который играет важнейшую роль в будущей жизни человека. При этом и русские, и американцы рождаются *«абсолютно необработанными»*.

«С момента появления на свет начинается эта самая обработка, заточка. В ней принимает участие множество сил: родители, знакомые, воспитатели, учителя, образ жизни, общепринятые условности – словом, всё, что нас окружает. Вот это самое окружение и затачивает нас так, чтобы мы подходили ему, как прилаженная деталь сверхсложного механизма», – объяснил свое видение Познер.

Журналист добавил, что именно эта целевая, адресная заточка создает *«то самое специфическое»*, что определяет национальные черты. По мнению Познера, заточка завершается в подростковом возрасте, в 15–16 лет, после чего человека уже нельзя «перезаточить».

«Мы можем приспособиться к новым обстоятельствам, можем – если природа наделила нас таким талантом – в совершенстве изучить чужой язык и говорить на нем без акцента, можем, словно хамелеоны, слиться с окружением, но… заточка остается, и мы до самой своей смерти в инородной среде остаемся чужими, как бы иные ни кричали, что они – «настоящие» американцы, немцы, англичане, французы, австралийцы…» – заключил телеведущий.

СЛЫШАЛИ?

Еще в двух городах России появится метро

*Вице-премьер **Марат Хуснуллин** заявил, что начатые проекты по строительству метро в Челябинске и Красноярске будут завершены. Об этом он сказал в эфире телеканала «Россия 24».*

По его словам, в Челябинске его достроят по новой комбинированной схеме. Речь идет о создании трамвайного пути, часть которого пройдет под землей. Такое решение связано с небольшой заселенностью города и высокой стоимость строительства традиционного метро.

«Со следующего года приступаем к строительству, нормативный срок – пять-шесть лет, я думаю, что за три, максимум четыре года построим», – заключил Хуснуллин.

Строительство метро в Красноярске и его проект вице-премьер намерен обсудить с губернатором города **Александром Уссом** в ближайшее время. Кроме того, по его словам, власти также активно обсуждают продление линий метро в Нижнем Новгороде.



НУ И НУ!

Олимпийские игры впервые в истории пройдут без зрителей

Власти Японии приняли решение закрыть стадионы в столичных регионах для всех зрителей. Впервые в истории Олимпийские игры пройдут практически при пустых трибунах, сообщает *Kyodo*.

Запрет на допуск зрителей распространен в префектурах Токио, Канагава, Тиба и Сайтама – в этих регионах пройдет большая часть спортивных соревнований Олимпиады. Организаторы рассматривают возможность всё же допустить местных жителей на стадионы в префектурах Мияги, Ибараки, Сидзуока и Фукусима. Здесь запланированы соревнования по менее популярным видам спорта: велотреку, софтболу и бейсболу.

Япония также ввела режим чрезвычайной ситуации на время проведения Олимпийских игр, то есть с 12 июля по 22 августа.

Олимпиада в Токио должна была пройти с 24 июля по 9 августа 2020 года. Однако из-за пандемии ее перенесли на год. Теперь ее проведут с 23 июля по 8 августа 2021-го. Организаторы Олимпийских и Паралимпийских игр в Токио потратят 100 миллиардов иен (960 миллионов долларов), чтобы обеспечить меры против распространения коронавируса. Власти Японии планировали сначала допустить на Олимпийские игры до 10 тысяч зрителей, затем ограничивали лимит до 5 тысяч и запретили приезжать на матчи иностранным болельщикам.

ЭКОЛОГИЯ

Евросоюз наложил штраф на Volkswagen и BMW

Еврокомиссия расследовала дело о картельном сговоре между пятью немецкими автопроизводителями.



Дело касалось картельных договоренностей о технологиях по очистке выхлопа дизельных автомобилей. По данным Еврокомиссии, Daimler, BMW, VW, Audi и Porsche регулярно проводили совещания, на которых обсуждалось, как устранить вредные выхлопы с содержанием окиси азота с помощью добавления вещества AdBlue. В ходе этих встреч они договорились не конкурировать друг с другом в очистке выхлопов выше установленной законом нормы, несмотря на то, что располагали технологиями, позволяющими очищать вредные выхлопы значительно лучше, чем предписано нормами ЕС, констатировала комиссар Евросоюза по вопросам конкуренции Маргрете Вестагер, подчеркнув, что конкуренция и инновации имеют решающее значение для выполнения Европой задач по защите климата.

Все компании признали участие в сговоре и согласились на мировое соглашение.

В результате решения Еврокомиссии Volkswagen (VW) должен заплатить 502 миллиона евро, а BMW – 373 миллиона. Daimler полностью освобожден от уплаты штрафа, поскольку именно он проинформировал Брюссель о сговоре. В противном случае ему пришлось бы заплатить 727 миллионов евро.

Работа на удаленке – на пользу окружающей среде

Экологи утверждают, что работа на удаленке снижает выбросы CO_2 в атмосферу. Однако этот эффект зависит от времени года и климатических условий в разных странах.

Два сценария

Во время пандемии COVID-19 появилось уже несколько исследований о том, как работа на удаленке может помочь в борьбе с изменениями климата. Еще в июне 2020 года *Берлинский институт научного прогнозирования и оценки технологий* (IZT) опубликовал сделанное по заказу *Greenpeace* исследование о том, как работа на удаленке хотя бы части жителей Германии помогла бы снизить вредные выбросы в атмосферу. Авторы разработали два сценария – консервативный и прогрессивный.

При консервативном сценарии, который предусматривает, что 25 процентов сотрудников в Германии будут два дня в неделю работать из дома, выбросы двуокиси углерода (CO_2) в атмосферу, связанные с поездками на работу, снизятся на 3,2 миллиона тонн. При прогрессивном сценарии эффект еще выше: если 40 процентов сотрудников будут по два дня в неделю работать из дома, выбросы CO_2 могут сократиться на 5,4 миллиона тонн в год.

Меньше поездок на работу и экономия энергии

Согласно новому исследованию британской экологической организации *Carbon Trust* по заказу *Институт общества и коммуникаций Vodafone*, пандемия и связанная с ней работа на удаленке уже привели к значительному сокращению выбросов CO_2 в атмосферу. Ученые, в частности, выяснили, что в Германии в период с марта 2020 года по март 2021 года в среднем 18,4 миллиона человек работали из дома около 3,5 дня в неделю. В результате выбросы CO_2 на каждого сократились на 72 процента. Как отмечает информационное агентство *dpa*, расчеты для Германии были основаны на данных Федерального статистического ведомства, Министерства экономики ФРГ и немецкого объединения предприятий цифровой экономики Bitkom.

В своем исследовании *Carbon Trust* сравнил баланс CO_2 при работе на удаленке в шести странах: Германии, Великобритании, Швеции, Италии, Испании и Чехии. Решающую роль при этом, как считают эксперты, играет время года и климатические условия.

Причина снижения выбросов CO_2 заключается, с одной стороны, в сокращении количества поездок на работу и домой. С другой стороны – в более низком потреблении электроэнергии из-за того, что офисы были закрыты или использовались не в полной мере. Однако при этих расчетах не учитывался тот факт, что повышение потребления электроэнергии происходило за пределами офисов – в домах и квартирах людей, работавших в это время на удаленке.

Время года и географическое положение

Однако, по данным экспертов, показатели потребления энергии напрямую зависят от времени года. В частности, работа в офисах зимой может быть более эффективной с точки зрения экономии этих ресурсов. Например, поездки на работу на железнодорожном транспорте в холодное время года приводят в итоге к меньшим выбросам CO_2, чем во время работы дома и связанных с этим повышенных затратах энергии на отопление жилья.

Эксперты подчеркивают, что следует также учитывать климатические различия между временами года в конкретных странах. В Германии и Швеции зимой, например, доля использования электроэнергии для отопления намного выше, чем в Испании или Италии. И наоборот: летом в Испании используется больше электроэнергии для систем кондиционирования воздуха. Поэтому здесь, согласно выводам экспертов, работа в офисах в теплое время года зачастую оказывается эффективнее, чем работа на удаленке, с точки зрения сокращения потребления электроэнергии и соответственно уменьшения вредных выбросов CO_2 в атмосферу.

ПАЗІЦЫЯ

Людміла КАЗАК, былая адвакатка:

«Свабода – гэта чыстае сумленне і незапэцканыя рукі»

Чаму адны баяцца выказваць грамадзянскую пазіцыю, а іншыя – не? Што фарміруе і падтрымлівае ўнутраную свабоду чалавека? Ці варта ўсё гэта таго, каб трываць нягоды? У праекце «Што робіць мяне свабодным» даём слова людзям, чые ўчынкі прыцягнулі да сябе ўвагу пасля жніўня 2020 года.

Хто такая Людміла Казак

Людміла Казак – адвакатка з 20-гадовым стажам. Мае сям'ю, траіх дзяцей.

Пасля выбараў аказвала юрыдычную дапамогу пацярпелым у пратэстах.

Стала абаронцай Марыі Калеснікавай пасля таго, як яна і яе адвакаты Максім Знак і Ілля Салей на пачатку верасня 2020 года аказаліся фігурантамі крымінальнай справы.

24 верасня Людмілу Казак затрымалі і неўзабаве прызналі вінаватай у адміністрацыйным правапарушэнні паводле арт.23.4 КаАП. У лютым 2021 года яе за гэта пазбавілі адвакацкай ліцэнзіі на падставе пастановы Міністэрства юстыцыі.



«У любы момант можна захаваць сумленне і адмовіцца ад супрацьпраўных патрабаванняў»

– Што прымусіла вас адкрыта выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю?

– У мяне ўжо быў досвед па палітычных справах («Плошча-2010», «Белы легіён»). Але падзеі 2020 года відавочна адрозніваліся па сваіх маштабах. Напрыканцы траўня арыштавалі Сяргея Ціханоўскага, і я пачала працаваць па гэтай справе. Тады ж упайшлі і першыя адміністрацыйныя справы. І іх колькасць сведчыла, што наша грамадства на мяжы сур'ёзных падзей. Што тычыцца абароны Марыі Калеснікавай, то я заключыла з ёй дамову яшчэ ў ліпені 2020 года. З улікам асобы Марыі я не сумнявалася, што буду аказваць ёй юрыдычную дапамогу.

Калі ў верасні арыштавалі яе першых адвакатаў Максіма Знака і Іллю Салея, калі ўзніклі праблемы з ліцэнзіяй у трэцяга адвоката Аляксандра Пыльчанкі, я ў душы ўжо была гатова, што мяне не міне такі самы лёс. Я і раней сутыкалася з прэтэнзіямі Мін'юста. І выдатна ведаю, што за намі пільна прыглядаюць. Але падзеі разгорталіся так імкліва, я была занята ў такой вялікай колькасці спраў, што забывала пра тое, што мяне таксама могуць закрануць рэпрэсіі.

Галоўным узрушэннем пасля выбараў для мяне стала жорсткасць улады да сваіх жа грамадзян, шматлікія парушэнні іх правоў. Адвакаты бачылі гэта на свае вочы, працуючы на Акрэсціна 9–11 жніўня. Мы не толькі працавалі ў судах, але арганізавалі дзяжурства каля ізалятара, дзе юрыдычная дапамога аказвалася практычна нон-стоп. Потым пачалі з'яўляцца першыя падазраваныя па крымінальных справах, звязаных з пратэстамі. І я на свае вочы бачыла цялесныя пашкоджанні кліентаў, слухала з першых вуснаў апісанне тых падзей. Гэта было жудасна і накладала велізарны адбітак. Хацелася максімальна дапамагчы людзям.

Чаму суддзі не заўважалі тых траўмаў і парушэнняў правоў? Мы абмяркоўвалі гэта ў сваіх колах. І ў мяне адзін адказ: суддзі, якія ў той смутны час выконвалі сваю «працу», апынуліся там невыпадкова. Яны, верагодна, і дагэтуль пастаянна працавалі па такіх справах, і для іх па вялікім рахунку не было нічога новага. І раней неправамерныя рашэнні па справах, звязаных з удзелам у масавых мерапрыемствах, былі пастаўлены на паток. Такі самы канвеер паўтарыўся і летам 2020 года. Але трэба адзначыць, што значная частка пастаноў па адміністрацыйных справах за 9–11 жніўня, разгледжаных на Акрэсціна, былі пазней адменены гарадскім судом. Было так шмат працэсуальных парушэнняў, што вышэйстаячы суд не мог не рэагаваць.

З часам, мабыць, тыя суддзі пераканаліся, што знаходзяцца пад абаронай дзяржавы, прызвычаіліся да думкі, што проста робяць сваю справу, і таму канвеер не спыніўся. Тое, што адбывалася ў жніўні, працягваецца і цяпер.

Я азнаёмілася са спісам асоб, хто трапіў пад апошнія санкцыі, і магу адзначыць, што кожны прадстаўнік судовай і праваахоўнай сістэмы апынуўся там абсалютна невыпадкова.

Ці можна было ім адмовіцца? Мы ж ведаем гісторыю суддзі з Пінска Аляксея Пацко. Гэта яркі прыклад, што можна ў любы час захаваць сваё сумленне і адмовіцца ад таго, што табе навязваюць. Спадзяюся, што ён быў такі не адзін.

«Зачыняюцца адны дзверы – адчыняюцца іншыя, калі зроблены правільны выбар»

– Што вы страцілі за сваю актыўнасць?

– Я страціла самае важнае – сваю любімую працу, якой аддадзена пара дзясяткаў гадоў. Страціла сваіх кліентаў, якія па-ранейшаму маюць патрэбу ў дапамозе. Гэта не толькі Марыя Калеснікава. Некаторыя кліенты засталіся без маёй дапамогі на піку патрэбы. Я дагэтуль атрымліваю ад іх словы падтрымкі і спагады.

Але калі зачыняюцца адны дзверы – адчыняюцца іншыя, галоўнае – зрабіць правільны выбар. Адчыніліся яны і перада мной. Таму я ні кропелькі не сумую. Я працаздольная, ведаю, якую карысць магу прынесці грамадству, маю магчымасць прымяняць свае веды. Хай не так, як раней, але гэта часова. А ў найбліжэйшай будучыні, упэўнена, мае магчымасці толькі пашырацца.

На днях была апеляцыя па маёй справе. Я доўга сумнявалася, ці ісці, бо вынік быў відавочны. Але ўсё ж такі змарнавала пару гадзін і атрымала чаканае рашэнне, што «ўсё было законна». Тым не менш я лічу важным давесці гэтую справу да канца. Буду абскарджваць далей у парадку нагляду, прайду ўсю працэдуру ў межах нацыянальнага заканадаўства, а потым, думаю, звярнуся ў міжнародныя інстанцыі, бо на тое ёсць усе падставы.

Дзяржаўныя органы пра мяне не забыліся. На дадзены момант падатковую інспекцыю вельмі цікавіць маё фінансавае становішча за апошнія 10 гадоў. Высветлілася, гэта адна з «фішак», якую стасуюць сёння шмат да каго. Гэта, вядома, нервуе. Але праз прыродны аптымізм я да выпрабаванняў стаўлюся спакойна.

Сяброў, калег я не страціла, бо ў маім асяроддзі надзейныя, прыстойныя людзі. Усе засталіся са мной і падтрымліваюць, як могуць. А з тымі, хто мае іншыя погляды, мы засталіся ў звычайных працоўных адносінах.

Відавочных наступстваў для маёй сям'і не было, хоць усё можа здарыцца. Пакуль сітуацыя непрадказальная, і я, вядома, перажываю за дзяцей, мужа. І яны хвалююцца за мяне. На мужа легла больш вялікая адказнасць па ўтрыманні нашай немалой сям'і. Гэта адбіваецца і фінансава. Але ўсё вырашальна.

Што я магу сказаць тым, хто тлумачыць сваю бяздзейнасць, маўчанне клопатам аб сям'і? Нічога. Калі людзі самі, праз асабісты досвед не прыйдуць да разумення, што трэба мяняць пазіцыю, на іх ніхто звонку не паўплывае.

– Што вы здабылі праз актыўную пазіцыю?

– Абараняючы Марыю Калеснікаву, я пазнаёмілася з высакароднымі людзьмі, набыла сярод іх сяброў. Сёння побач са мной толькі годныя, прыстойныя, ідэйныя людзі. Гэта галоўны набытак.

– Ці было гэта таго варта?

– У мяне няма ніякіх сумневаў. Я зрабіла ўсё як трэба, і нават больш. Па ўсіх справах, у тым ліку па абароне Марыі Калеснікавай, я правяла велізарную працу, за якую мне не сорамна. І стаўленне маіх былых кліентаў пацвярджае, што я ўсё рабіла правільна.

Я вельмі рада, што ў такі складаны для краіны перыяд была менавіта адвакатам, бо гэта прафесія аказалася запатрабаванай і вырашальнай, дазволіла мне дапамагаць людзям.

Я шчаслівая, што ў мяне чыстае сумленне і не запэцканыя рукі.

Я ўпэўнена, што хутка праваvы дэфолт у краіне скончыцца і мы вернемся да нармальнага становішча, усе змогуць працаваць па законе, людзі не будуць баяцца хадзіць па вуліцах і выказваць сваю думку.

Ці зменіцца ментальнасць праваахоўнікаў і суддзяў, якія парушалі закон да гэтага? Думаю, што ў новых абставінах наўрад ці яны будуць на сваіх пасадах. Ім прыйдзецца жыць з каменем на сэрцы за тое, што яны робяць цяпер.

– Што фарміравала вашу ўнутраную свабоду?

– Я лічу, што гэта відавочны ўплыў адвакацкай прафесіі, тых задач, якія стаяць перад абаронцай. Гэта суадносіцца і з маёй унутранай патрэбай у справядлівасці і праўдзе. Хлусню я ненавіджу. Мне пашанцавала, што ўнутраныя памкненні і рысы характару супалі з выбарам прафесіі.

– Што рабіць сёння, каб супрацьстаяць злу і несправядлівасці?

– Не спыняцца самім. І паважаць тых людзей, дзякуючы намаганням якіх працэс вяртання закону і дабра не спыняецца ні на хвіліну. Намаганні кожнага прывядуць да агульнай перамогі.

(Радыё Свабода)

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Хто такі Пётр Кузняцоў?

«Амаль кожны дзень на розных сайтах з'яўляюцца каментары па тых ці іншых падзеях заснавальніка партала «Сильные новости» Пятра Кузняцова. Распавядзіце, калі ласка, больш падрабязна, што гэта за чалавек – журналіст, блогер?..»

Сяргей АНІШЧАНКА, Мінск.

Пётр Кузняцоў – заснавальнік папулярнага на Гомельшчыне партала грамадска-палітычных навін «Сильные новости».

«Я нарадзіўся ў 1981 годзе ў Гомелі, – распавядаў **Пётр Кузняцоў** Радыё Свабода. – *Пайшоў у школу пры БССР. Памятаю першы буквар з «Ленин жил, Ленин жив, Ленин будет жить». Атмасферу савецкай школы я запомніў на ўсё жыццё. Нягледзячы на мегатоны прапаганды, якая вылівалася на нашы дзіцячыя мазгі, чытанне прывучыла мысліць самастойна. У выніку я прыйшоў да поўнага непрымання «саўка».*

Я вучыўся спачатку ў школе №3 – і гэта быў унікальны досвед, таму што ў 1980–1990-х гэта была самая крымінальная школа ў горадзе. Потым – у гімназіі №56, затым – на юрыдычным факультэце. Займаўся музыкай – іграў на балалайцы і гітары, шмат ездзіў на гастролі па замежжы. Захапляўся «Што? Дзе? Калі?».

Журналістыка была мне цікавая, наваt хацеў паступіць у журналісцкі клас, але бацькі настаялі на юрыдычным».



З 2004 года Пётр Кузняцоў браў актыўны ўдзел у шэрагах дэмакратычнага руху. У 2008-м прысутнічаў у якасці абласнога прадстаўніка адной з дэмакратычных арганізацый у абласной радзе Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Там і выступіў з прапановай стварыць свой інфармацыйны рэсурс.

«Я стварыў сайт odsgomel.org (ODS – ад «Объединенные демократические силы»), – працягвае Пётр. – *Мы пачалі рабіць альтэрнатыўныя навіны, як маглі на той момант. Вялі там блогі – Васіль Палякоў, Леанід Судаленка і я.*

Пасля 8–9 месяцаў працы сайта тая ж рада прапанавала яго закрыць – маўляў, няма рэсурсу падтрымліваць. Хаця тады на працу сайта хапала ўсяго 150 еўра. Праўда, і чыталі яго 60 чалавек у дзень. Я выступіў супраць закрыцця. Тады мне сказалі, што я магу працягваць весці сайт, але ў назве не павінна быць «Объединенные демократические силы». Тады я змяніў расшыфроўку: «ODSgomel.org – Общественно-демократический сайт Гомеля».

Калі наш сайт дабіўся поспеху, то людзі, якія яго адкрылі, а потым спрабавалі закрыць, казалі, што ў яго ўбухалі дзясяткі тысяч долараў, а Кузняцоў іх скраў. Гучыць смешна: дзе сённяшнія «Сильные новости» з наведвальнасцю каля мільёна ў месяц і дзе odsgomel.org часоў кааліцыі з бюджэтам 150 еўра і наведвальнасцю 60 чалавек?»

Сам брэнд «Сильные новости» з'явіўся ў 2010 годзе. У 2014 годзе адбыўся канчатковы рэбрэндынг, і сайтператварыўся ў «Сильные новости – Gomel.Today». Гэта быў чыста інфармацыйны праект з місіяй несці людзям праўдзівую інфармацыю.

У 2020 годзе журналістаў «Сильных новостей» затрымлівалі, кідалі на «суткі», у офісе забралі ўсю тэхніку. Але сайт і яго каманда працягнулі працу.

P.S. 9 ліпеня сілавікі правялі ператрусы ў 10 супрацоўнікаў «Сильных новостей» у межах крымінальнай справы супраць удзельнікаў пратэстаў. Былі канфіскаваны камп'ютары і тэлефоны.

Як паведаміў Пётр Кузняцоў, следчыя дзеянні праходзілі ў работнікаў партала як па месцы прапіскі, так і па месцы жыхарства, а таксама на лецішчах і ў аўтамабілях.

Віктар ШПАК.

ПАЛІТКУХНЯ

Глеб ГЕРМАНЧУК:

Маем ужо каля 7000 заявак на ўступленне ў партыю…

29 сакавіка гэтага года паплечнікі экс-прэтэндэнта на прэзідэнцкую пасаду **Віктара Бабарыкі**, які зараз знаходзіцца за кратамі, абвясцілі, што ў Беларусі можа з'явіцца новая партыя «Разам», якая аб'яднае апазіцыйныя сілы.

– Ніякіх карэкціровак нашых планаў пасля таго, як Віктару Дзмітрыевічу абвясцілі прысуд – 14 гадоў зняволення, не адбылося, – *распавёў «Народнай Волі»* ***Глеб ГЕРМАНЧУК*** *– прэс-сакратар штаба Віктара Бабарыкі.* – На дадзены момант маем каля 7000 заявак на ўступленне ў партыю, запоўненых анкет – 3729.

На нашай анлайн-сустрэчы налічвалася каля 1700 чалавек. Былі спробы правесці афлайн-сустрэчы з нашымі прыхільнікамі ў Гродне, Маладзечне, але, на жаль, па розных прычынах гарадскія ўлады нам адмовілі ў прадастаўленні пляцовак. Хаця раней як быццам былі і не супраць.

– Якія прычыны адмовы?

– Маўляў, зараз дзейнічаюць кавідныя абмежаванні. Або казалі, што пляцоўка проста занята. Адным словам, зараз арганізаваць рэальныя сустрэчы з людзьмі проста нерэальна.

У краіне на гэты момант высокі ўзровень рэпрэсій, таму мы, каб не падстаўляць людзей, вырашылі пакуль сустрэчы ладзіць у анлайн-фармаце. Падчас іх праводзім трэнінгі, рэалізоўваем адукацыйныя праграмы. У першую чаргу вядзём гаворку пра партыйнае будаўніцтва, пра нашы планы і праграму.

Віктар Дзмітрыевіч Бабарыка ўжо год знаходзіцца ў СІЗА, але штаб здолеў мабілізавацца і працягнуць працу. Таму і зараз не спыняемся.

– Якія бліжэйшыя планы?

– Як вядома, па законе для правядзення з'езда і стварэння партыі неабходна не менш за тысячу сябраў арганізацыі. Але ў той жа час бачым шмат перашкод, таму не думаю, што правядзенне з'езда – гэта хуткая справа. А дыстанцыйна правесці з'езд не атрымаецца.

Зараз праходзіць сур'ёзная праверка тых, хто жадае ўступіць у партыю. Сацыяльныя слаі ў нас прадстаўлены самыя розныя: і простыя рабочыя, і кіраўнікі фірм, і прадстаўнікі IT-сферы. Гэта вельмі важны рэсурс, які мы будзем захоўваць і мабілізоўваць у палітычную структуру, якую паспрабуем зарэгістраваць.

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
13 ЛІПЕНЯ 2021 г.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Каханне праз краты


Як праходзяць вяселлі ў беларускіх СІЗА


Валерыя Латош ў СІЗА ў Горадні.

Кветкі, пярсцёнкі, усмешкі і слёзы – амаль звычайныя вясельныя фота, толькі нявеста на іх адна, і сустракаюць яе не ў загсе, а ля турэмнай брамы. Жонкі беларускіх палітвязняў распавялі ***DW*** *пра свае вяселлі ў СІЗА.*

«У пакоі, куды мяне прывялі, была клетка метр на метр, Міша сядзеў у ёй. Потым яго выпусцілі, дазволілі стаць побач. Ён не чакаў, што я буду такая прыгожая», – распавядае Валерыя Латош. Нядаўна яна выйшла замуж за палітвязня Міхаіла Юдзіна пасля 15 гадоў сумеснага жыцця. «У лютым я змагла патрапіць да яго на спатканне. Мы размаўлялі, ён глядзеў на мяне закаханымі вачыма, а потым сказаў: «Выходзь за мяне замуж», – успамінае жонка палітвязня Віктара Панцялеева Яўгенія. Маладыя людзі аднавілі стасункі пасля затрымання Віктара ў жніўні 2020 года, а сёлета вясной ажаніліся. Яўгенія і Валерыя падзяліліся сваімі гісторыямі, распавялі, як праходзіць вяселле ў беларускім СІЗА і чаму яны адважыліся на такі крок.

Падчас цырымоніі «мы павінны трымацца на адлегласці метр адзін ад аднаго»


Віктар і Яўгенія Панцялеевы, фота з сямейнага архіва.

«Працаўніца СІЗА папярэдзіла мяне, што мы з Віцем павінны трымацца на адлегласці метр адзін ад аднаго, не цалавацца, не абдымацца. У мяне ад гэтага – адразу слёзы. Я думала, што я хаця б змагу абняць яго, дакрануцца. Гэтая думка падбадзёрвала і супакойвала, – успамінае цырымонію шлюбу ў Брэсцкім ізалятары Яўгенія Панцялеева. – *Пасля двух КПП мяне прывялі ў невялікае памяшканне з абразамі, у так званы пакой святара* (дзе павінна была адбыцца рэгістрацыя шлюбу. – **Рэд.**). *Мы чакалі Віцю хвілін дзесяць, і яны падаліся мне вечнасцю. Калі ён увайшоў, мы абодва былі разгублены, таму што вельмі хацелі адзін аднаго абняць».*

Яўгенія выйшла замуж за палітвязня Віктара Панцялеева 27 красавіка. Яго затрымалі 18 жніўня мінулага года ў рамках крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» у Брэсце пасля абвяшчэння вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, а 21 мая асудзілі да чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

«Магчыма, калі б Віця не трапіў у гэтую сітуацыю, мы не зразумелі б, што сапраўды адзін аднаго кахаем, не адважыліся б ажаніцца», – кажа Яўгенія. Маладыя людзі былі разам чатыры гады, але ў маі 2020 рассталіся. Аднавілі стасункі пасля затрымання Віктара – Яўгенія стала пісаць яму ў СІЗА. *«Спачатку ён пісаў, што хутка будзе дома, была надзея, што яго адпусцяць. У лютым я змагла патрапіць да яго на спатканне. Мы размаўлялі, ён глядзеў на мяне закаханымі вачыма, а потым сказаў: «Выходзь за мяне замуж»,* – дзеліцца Яўгенія.

«Вяселле ў СІЗА гэта актуальна, па-беларуску»


Яўгенія Панцялеева ў СІЗА ў Брэсце.

Дзяўчына спачатку трохі сумнявалася, а потым зразумела, што *«вяселле ў СІЗА – гэта актуальна, па-беларуску»*, і пагадзілася. Яўгенію падтрымалі родныя і сябры, а таксама сваякі іншых палітвязняў і людзі, якія самі прайшлі праз затрыманні. *«У дзень вяселля мяне падтрымала мама палітвязня Алена Тур. Мне бясплатна зрабілі вельмі прыгожы букет. Сукенку набыла, прычоску рабіла дзяўчынка, якая таксама сядзела на «сутках». Мне дапамагалі людзі, якія трапілі ў такую ж сітуацыю».*

Паводле слоў суразмоўніцы, сама цырымонія шлюбу доўжылася не больш за 10 хвілін, увесь гэты час Яўгенія глядзела на Віктара і нават не чула, што казала рэгістратар: *«Трымалася, каб не плакаць перад работнікамі СІЗА, але мяне трэсла. Калі я выйшла за браму, убачыла маму Марыны Глазавай, якая праходзіць па «карагоднай справе», бацькоў Давіда Збаранскага, непаўналетняга хлопчыка, якога абвінавачваюць па такім жа артыкуле, як і Віцю* (ч.2 арт.293 КК РБ «Удзел у масавых беспарадках». – **Рэд.**). *Нават у таты Давіда на вачах былі слёзы. Я таксама расплакалася».*

Пасля вяселля ў маладых было яшчэ два спатканні, затым Яўгенія з'ехала з Беларусі, баючыся праследу з боку сілавікоў, а Віктара адправілі адбываць пакаранне ў адну з калоній. Дзяўчына не губляе надзеі на хуткае вызваленне мужа. *«Я ні з кім не буду такая шчаслівая, як з Віцем. Некаторыя людзі шукаюць сваё шчасце шмат гадоў, а яно ў мяне побач. Чаму я павінна ад яго адмаўляцца? Калі любіш, любая праблема вырашаецца значна прасцей»,* – упэўнена суразмоўца.

«Было пачуццё свята, хай і сумнага»


Валерыя Латош і Міхаіл Юдзін, фота з сямейнага архіва.

Валерыя Латош з Гродна таксама верыць, што яе муж палітвязень Міхаіл Юдзін хутка выйдзе на волю. Міхаіла затрымалі на вачах у Валерыі 27 верасня мінулага года. Яго абвінавацілі паводле арт.364 КК («Гвалт у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі») і асудзілі да 4 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Сам Міхаіл віну не прызнаў і распавядаў у судзе, што ён з Валерыяй прыехаў у кінатэатр і перад сеансам вырашылі зайсці ў бар. На вуліцы мужчына ўбачыў, што людзі *«ў чорнай вопратцы»* цягнулі чалавека, а гараджане разбягаліся з прыпынку. Міхаіл спытаў: *«Што вы робіце?»* У адказ яму пырснулі з газавага балончыка ў твар і затрымалі. У аўтобусе АМАПа яго ўдарылі ў плечы гумовай дубінкай і паклалі на падлогу.

«Я не думала, што ўсё будзе так сур'ёзна, але на волю ён так больш і не выйшаў, хоць мы і прасілі змяніць меру стрымання», – распавядае Валерыя. Міхаіл і Валерыя разам ужо шмат гадоў, у іх дзве дачкі, але штамп у пашпарце з'явіўся нядаўна: *«Калі пачынаецца побыт, ужо не да святаў, стараешся эканоміць. Мы лічылі: калі трэба будзе – пажэнімся. Хоць прапанову Міша зрабіў яшчэ на пачатку адносін».*


Міхаіл Юдзін і Валерыя Латош з дзецьмі, фота з сямейнага архіва.

Пара вырашыла ажаніцца пасля таго, як Міхаілу Юдзіну вынеслі прысуд. Гэта было проста неабходна, адзначае Валерыя: толькі блізкія сваякі могуць атрымліваць спатканні і рабіць перадачы ў калонію.

Цырымонія прайшла ў гродзенскім СІЗА 5 мая. *«Напярэдадні многія людзі напісалі, што хочуць пасля павіншаваць мяне. Значыць, трэба прыстойна выглядаць. Я купіла строй і пярсцёнкі, мая былая аднакласніца мяне нафарбавала, прычоску дзяўчынкі зрабілі. У пакоі, куды мяне прывялі, была клетка метр на метр, Міша сядзеў у ёй. Потым яго выпусцілі, дазволілі стаць побач. Ён не чакаў, што я буду такая прыгожая. Я адразу «прыліпла» да яго»,* – успамінае Валерыя і кажа, што, нягледзячы ні на што, у яе было пачуццё свята, хай і сумнага.

Ёй адной з двума дзецьмі бывае няпроста, да таго ж у студзені Валерыя страціла працу юрыста ў паліклініцы – з ёй не працягнулі кантракт з-за выхаду з прафсаюза. Нядаўна жанчына ўладкавалася мерчандайзерам. Валерыя кажа, што, як ні дзіўна, у сітуацыі, якая склалася, вялікую падтрымку ёй аказалі чужыя людзі: *«Калі казаць пра маіх сяброў, то многія адпалі, я нават не чакала. Я адчула салідарнасць ад чужых людзей: пішуць у сацсетках, прапануюць дапамогу. Напрыклад, прывезлі вядро трускалак – гэта было прыемней, чым калі б мне тысячу долараў далі. Нядаўна нам і сем'ям іншых палітвязняў мясцовы блогер арганізаваў паход у парк забаў, усе былі шчаслівыя. Адразу кажу дочкам, што пра гэта трэба расказаць таце, і яны напісалі Мішу лісты».*

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Чэмпіёнка свету па фрыстайле працуе ў фотаагенцтве

*4 лютага гэтага года **Аляксандра Раманоўская** была афіцыйна звольнена з Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі.*



Звольнілі спартсменку як быццам за прагулы, хаця ўсім было зразумела – за грамадзянскую пазіцыю. Аляксандра падпісала ліст за новыя выбары і супраць гвалту, удзельнічала ў запісе відэазвароту да чыноўнікаў беларускага спорту, якія аказваюць ціск на спартсменаў за іх патрабаванне спыніць гвалт і аднавіць справядлівасць.

«Гэтага можна было чакаць, – казала тады фрыстайлістка пра сваю «адстаўку». – *Мяне хацелі звольніць яшчэ ў кастрычніку, таму мой бальнічны проста перанёс гэты момант на больш позні тэрмін. І як толькі бальнічны закончыўся, яны адразу ж звольнілі мяне.*

У нашай краіне заўсёды спадзяешся на лепшае, а гатовы да горшага, таму нічога дзіўнага ў гэтым няма. Пакуль што няма ніякіх планаў, пустата нейкая. У першую чаргу ў бліжэйшы час буду вырашаць пытанні са здароўем. Для мяне зараз аднавіцца – самае галоўнае. А далей буду глядзець па сітуацыі».

Пра так званыя прагулы затым распавёў галоўны трэнер зборнай **Мікалай Казека**: *«Яе бацька перанёс інсульт, не было каму вазіць яго ў бальніцу. Гэтым займалася Аляксандра. Яна тэлефанавала, тлумачыла, але ніхто ў РЦАП не звярнуў на гэта ўвагі. Таму рашэнне аб звальненні, безумоўна, ангажаванае».*

Зараз Саша па-ранейшаму застаецца па-за спортам.

«У гэты момант графік у мяне больш вольны, чым год таму, але і так хапае пытанняў, якімі трэба займацца, – распавяла фрыстайлістка *zerkalo.io*. – *Таму дні праляцяць імкліва».*

Цяпер Аляксандра працуе менеджарам ў адным з мінскіх фотаагенцтваў. Ёй прапаноўвалі з'ехаць за мяжу, але спартсменка адмаўляецца. Стрымлівае і сямейная сітуацыя – у мінулым годзе бацька перанёс інсульт.

«Мая сям'я тут, і я ёй патрэбна, – кажа фрыстайлістка. – *У маім цяперашнім жыццёвым рытме нават цяжка ўявіць, як бы я зараз паўнавартасна займалася спортам і выязджала кудысьці на спаборніцтвы. Ёсць пытанні, якія нам з маці трэба вырашаць альбо разам, альбо па чарзе. Цяжкавата часам бывае, але спраўляемся».*

Паводле слоў спартсменкі, пакуль яна не гатова вярнуцца ў вялікі спорт. Перыяд аднаўлення пасля траўмы яшчэ не закончыўся. Зараз яна наведвае лекараў, ходзіць на заняткі да трэнера па лячэбнай фізкультуры.

І не выключае, што вернецца ў асноўны склад зборнай. Калегі, з якімі яна гутарыла, не бачаць для гэтага перашкод. Але адзначылі, што, мабыць, давядзецца пачынаць усё з чыстага ліста.

«Неверагодна сумую па адчуванні палёту і нават па старых фізічных нагрузках, – дадае чэмпіёнка свету. – *Гэтага вельмі не хапае. Бываюць моманты, калі сумна робіцца. Але за год не толькі ў маім жыцці многае памянялася, але і ў беларускім фрыстайле: атмасфера, начальства, стаўленне. Шмат перамен. Месца, дзе мы трэніраваліся, і тая абстаноўка, якая там была, – усё змянілася.*


У такой сітуацыі ты разумееш: так, як раней, ужо не будзе. У такія моманты ўсведамляеш, што атрымлівала задавальненне не толькі ад таго, што ты рабіла, але і ад атмасферы наўкол. Гэтыя перамены мяне таксама адштурхоўваюць. Няма жадання ўсё кінуць і бегчы туды...»

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

КРЫЖАВАНКА

«Веру, братцы, людзьмі станем»

15 ліпеня – 145 гадоў з дня нараджэння беларускай паэткі Цёткі (Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч)



Па гарызанталі: 1.Горад у Гродзенскай вобласці, недалёка ад якога ў фальварку Петчын 15 ліпеня 1876 года нарадзілася вядомая беларуская паэтка-рэвалюцыянерка, адна з пачынальніц беларускай прозы Цётка. 4.«Ліпень – з мёдам, // З пшаніцаю – ...» – з верша П.Панчанкі «Родная мова». 7.«Трон дрыжыць, не спяць прарокі, // Бог склікае святы ...» – з верша Цёткі «Мора» («Рэвалюцыя народная»). 8.«Пташкі задрыжалі, // ... сціхлі ў вуллях» – з верша Цёткі «Музыкант беларускі». 9.Мікраарганізм. 11.«А ў цёмным лесе агонь гарыць, // Каля агню ... сядзіць» – з купальскай песні. 14.«... шуміць каласамі // Жыта, спелага аўса» – з верша Цёткі «Лета». 15.Тое, што і біяполе. 16.Сухое, без дажджоў надвор'е. 17.«Веру, братцы, людзьмі станем, // Хутка скончым мы свой ...» – з верша Цёткі «Вера беларуса», які быў заклікам да барацьбы з расійскім царызмам. 20.Лета селяніну – ... і бацька (прык.). 21. ...-да-мар'я – травяністая расліна, з якой на Купалле дзяўчаты плятуць вянкі. 26. ... псуе фігуру, а яго адсутнасць псуе настрой (прык.); 11 ліпеня – Сусветны дзень ... . 28.«Ой, ... чырвоныя, // Чабаровы туман» – з верша В.Леанені «Ой, ... чырвоныя». 29.«Шануйце роднае ...» – артыкул Цёткі, які пераклікаецца з вершам Я.Купалы «Ворагам беларушчыны». 30.«Покуль сонца выйдзе, // ... выесць вочы» – з верша «Покуль сонца выйдзе» беларускага паэта, драматурга, фалькларыста Яна Чачота; 7 ліпеня – 225 гадоў з дня яго нараджэння. 31.Назва часопіса для дзяцей і моладзі, які Цётка заснавала і рэдагавала ў Мінску ў 1914 годзе. 32.«А там парэчка, там ..., // А там мой граб малы расце» – з верша Цёткі «Мой сад».

Па вертыкалі: 1.Чараванне, замаўленне шэптам. 2.Касьба. 3.«Народ чуе ... з неба, // Што свабоды яму трэба!» – з верша Цёткі «Хрэст на свабоду». 5.«Ой, ... і песня і слава» – з «Песні пра Нёман» (сл.А.Астрэйкі, муз.Н.Сакалоўскага); 24 ліпеня – 110 гадоў з дня нараджэння паэта-песенніка Анатоля Астрэйкі. 6.Грашовая адзінка некаторых заходнееўрапейскіх краін. 10.«Бо любіць народ свой Чачот, // І ў спевах пра даўніх ліцвінаў // Жыве залатая краіна» – з верша В.Шніпа «... Яна Чачота». 11.Літара лацінскага алфавіта. 12.Францішак ... – паэт, ідэолаг беларускага нацыянальнага адраджэння, пад уплывам якога з 1902 года пачала пісаць Цётка. 13.Баравік, які вырастае падчас каласавання жыта. 18.Прыбор для вызначэння бакоў свету. 19.Від мясцовасці. 22.Частка мясной тушы. 23.«У зелень апрануўся сад, // А ў садзе яркі квецень мая. // Пайшло ўжо сонца на ...» – з верша А.Астрэйкі «Квецень». 24.Кожны год мае свой ... (прык.). 25.Святы агонь у язычнікаў. 27.Вялікая доўгая ніва.

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Шчучын. 4.Жнівень. 7.Трон. 8.Пчолы. 9.Мікроб. 11.Купалка. 14.Ніва. 15.Аўра. 16.Суш. 17.Сон. 20.Маці. 21.Іван. 26.Шакалад. 28.Суніцы. 29.Слова. 30.Раса. 31.«Лучынка». 32.Маліна.

Па вертыкалі: 1.Шаптанне. 2.Укос. 3.Голас. 5.Нёман. 6.Еўра. 10.Балада. 12.Багушэвіч. 13.Каласавік. 18.Компас. 19.Панарама. 22.Ашыек. 23.Закат. 24.Яд. 25.Зніч. 27.Гоні.

Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

Пять продуктов, улучшающих состояние сердца за счет снижения холестерина

Одно из ведущих британских СМИ издание Express опубликовало мнение специалистов по поводу продуктов, способных улучшить состояние сердца за счет снижения уровня холестерина.

Прежде всего, необходимо добиваться снижения количества «плохого» холестерина ЛПНП, который накапливается в виде бляшек на стенках кровеносных артерий. Со временем эти холестериновые отложения разрастаются, что затрудняет прохождение достаточного количества крови по артериям. Иногда холестериновые бляшки отрываются от стенок и образуют сгусток: если он закупорит сосуд, может возникнуть сердечный приступ или инсульт.

Специалисты констатируют: высокий уровень холестерина может быть обусловлен наследственностью, но часто он является результатом нездорового образа жизни. Для борьбы с его избытком и с образованием холестериновых пробок в сосудах эксперты рекомендуют включать в рацион (при отсутствии противопоказаний) пять продуктов.

Авокадо. Является богатым источником мононенасыщенных жиров и клетчатки – двух питательных веществ, которые являются особенно эффективными, когда речь заходит о снижении концентрации «плохого» ЛПНП-холестерина. По данным Express, клинические исследования подтверждают данный эффект растительного продукта. Одно из исследований показало: в группе взрослых людей с избыточным весом и высоким уровнем холестерина ЛПНП, съедавших один авокадо в день, добились значительного снижения этого уровня по сравнению с теми, кто не употреблял «аллигаторову грушу».

Орехи. Грецкие орехи богаты растительным разнообразием жирных кислот омега-3, что важно для улучшения состояния сердца. В свою очередь миндаль богат L-аргинином – аминокислотой, которая помогает организму вырабатывать оксид азота, расслабляющий стенки сосудов и стабилизирующий кровяное давление. Вдобавок в орехах содержатся кальций, магний и калий – минералы, также способствующие нормализации показателей АД, что снижает риск сердечных заболеваний.

Фрукты и ягоды. Многие виды фруктов и ягод богаты растворимой клетчаткой – важным компонентом, помогающим снизить уровень холестерина благодаря специфическому усвоению. Кроме того, их биоактивные соединения обладают антиоксидантным и противовоспалительным действием.

Темный шоколад и натуральное какао. Их способность снижать уровень ЛПНП-холестерина в организме также подтверждается исследовательскими данными. Ученые полагают, что какао и темный шоколад защищают холестерин в крови от окисления, являющегося провокатором сердечных заболеваний. Согласно научным данным, люди, регулярно употребляющие какао (натуральное, без добавления сахара), уменьшают риск смерти от сердечно-сосудистых патологий.

Чеснок. Пряный овощ содержит различные мощные растительные соединения, в том числе его основное активное соединение – аллицин. Исследования показывают, что благодаря его действию может снижаться кровяное давление у людей с гипертонией.

(healthinfo.ua)

УСМІХНІЦЕСЯ...

Муж акуратна складвае ўсе бутэлькі з дамашняга бара ў сумку.
– Андрэй, навошта нам столькі? Мы ж усяго на два дні на лецішча едзем.
– Гэта не мы на два дні едзем... Гэта наш сын дома на два дні застаецца!



– А што рабіць, калі муж пайшоў налева?
– Ой, галоўнае – там з ім не сустрэцца!



– Міхась, а праўда, што я табе дадзена Богам?
– Так, Ганначка... Толькі за якія мае грахі, не ведаю!



Калі да вас раптам завіталі госці, а ў вас не прыбрана, то, перш чым адчыніць дзверы, пастаўце ў вітальні вядро з анучай і намачыце рукі. І вось у вас ужо не бардак у доме, а прыбіранне ў самым разгары.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 326-68-71
Рэкламны аддзел (017) 363-66-04
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).